ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 9 (1278) | ПАНЯДЗЕЛАК, 12-га студзеня 1931 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

X ЗЬЕЗД ЛКСМБ

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА УсеЛКСМ БЫЎ І БУДЗЕ УДАРНАЙ БРЫГАДАЙ НА ЎСІХ ФРАНТОХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ

Даклад тав. Наумава аб рабоце ЦК УсеЛКСМ*)

VIII ўсесаюзны зьезд сказаў, што неабходна накіраваць увагу ўсіх вясковых організацый на правядзеньне колектывізацыі. 8 зьезд сыгналізаваў аб замкнутасьці ў рабоце вясковых ячэек і неабходнасьці выйсьці на шырокую дарогу масавай работы, на шырокую дапамогу колектывізацыі сялянскай гаспадаркі.

8 усесаюзны зьезд сыгналізаваў аб небясьпецы, калі паасобныя ячэйкі і організацыі не скарысталі ўздым разьвіцьця агро-культурных мерапрыемстваў у напрамку разьвіцьця колектывізацыі, а ў паасобных мясцох рост комсамольскіх ячэек і комсамольцаў ішоў за лік уздыму і разьвіцьця індывідуальных гаспадарак і нават якія комсамольцы перарасталі ў кулакоў.

8 усесаюзны зьезд падкрэсьліў, што разьвіцьцё работы па ўздыму ураджайнасьці, па земляўпарадкаваньню павінна быць выкарыстана з мэтаю колектывізацыі сельскай гаспадаркі, утварэньня колгасаў.

У выкананьне гэтых дырэктыў УсеЛКСМ прарабіў значную работу. Мы організавалі паход за ўраджай, у час якога па ініцыятыве комсамолу ўтворана да 5000 колгасаў.

Мінулы пэрыяд з 8 зьезду па 9-ты для вясковага комсамолу зьяўляецца найвялікшай школай клясавай барацьбы.

Вясковы комсамол дабіўся вялікіх посьпехаў у справе рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, у барацьбе з клясавым ворагам, барацьба на два фронты—за генэральную лінію партыі. У восеньнюю пасеўную кампанію — у першую бальшавіцкую вясну, якую мы правялі, ахоп комсамольцаў колгасамі зьняўся да 37 проц. Больш 550000 вясковых комсамольцаў знаходзяцца ўжо ў колгасах, будуюць колгаснае жыцьцё. У шэрагу раёнаў комсамол і кіруемая ім рабочая моладзь вынесьлі на сваіх плячох усе цяжары, зьвязаныя з уборкай ураджаю, з правядзеньнем хлебазагатовак, пасеўкампаніі і колектывізацыі. Ім дасталася парадкам ў адносінах правядзеньня гэтых гаспадаркапалітычных кампаній на вёсцы. Тут комсамольскія організацыі прарабілі вялікую работу. Цэлы шэраг вясковых організацый комсамолу ідуць у ногу з гарадзкімі прамысловымі организацыямі КСМ.

Павышэньне ўдзельнай вагі вясковага комсамолу, павышэньне ўвагі комсамолу вёскі к пытаньням соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі—паказчык таго, што вясковыя організацыі перабудоўваюцца прыстасавальна к рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, к колектывізацыі, ідуць па шляху павароту тварам да колгаснага будаўніцтва. Аднак посьпехі, якія маюць вясковыя організацыі комсамолу, яшчэ невыстарчальны. Мы павінны дабіцца значна большых посьпехаў ва ўмацаваньні колгасаў, разьвіцьці савгасаў і МТС, у барацьбе за колектывізацыю ўзьняць організацыйнае значэньне ячэйкі сярод моладзі вёскі, колгасу."

Вы ведаеце, што ў практыцы правядзеньня колектывізацыі былі дапушчаны цэлым шэрагам нашых комсамольскіх організацый грубейшыя памылкі, перагібы. Многія організацыі надзвычайна захапіліся хуткімі тэмпамі колектывізацыі, хацелі колектывізаваць сельскую гаспадарку ў два шчоты, праяўлялі непатрэбную, нічым не апраўдваемую пасьпешнасьць. Нашы паасобныя організацыі, паасобныя ячэйкі і комсамольцы даходзілі да простага авантурызму ў адносінах да серадняка. Парушэньне прынцыпу добраахвотнасьці, забыцьцё ву оту, рознастайнасьць умоў розных раёнаў СССР, пераскакваньне праз незакончаныя формы колгаснага руху і шэраг іншых перабояў прынесьлі нам вельмі многа шкоды ў адносінах саюзу рабочае клясы з сялянствам, паставілі пад пагрозу гэты саюз. Замест вучэньня партыі аб правільных адносінах да серадняка, як да саюзьніка рабочае клясы, былі дапушчаны скажэньні ў бок націску на серадняка.

Кіраўніцтва комсамолу ў значнай частцы акруговых організацый і частцы абласных, не організавала сваечасовага і ў дастатковай ступені растлумачэньня рашэньняў партыі, дрэнна сыгналізавала аб тых памылках якія дапушчалі вясковыя ячэйкі.

Сваечасовыя і рашучыя меры ЦК УсеКП(б) і т. Сталіна па мобілізацыі партыі на барацьбу з скажэньнямі лініі партыі стварылі пералом і забясьпечылі выпраўленьне дапушчаных памылак і перагібаў.

Лінія Цэнтральнага Камітэту УсеЛКСМ была ў гэтых адносінах самая выразная, зусім правільная ў галіне мобілізацыі комсамолу на справу разьвіцьця колектывізацыі сельскай гаспадаркі, нашы ўстаноўкі ў гэтых адносінах цалкам выходзілі з зусім правільных дырэктыў і ўстановак, якія даваў Цэнтральны Камітэт партыі. Цэнтральны Камітэт УсеЛКСМ зусім сваечасова і правільна прыняў меры па выпраўленьню памылак паасобных комсамольскіх організацый. Аб правільнай лініі ЦК УсеЛКСМ і сваечасовых мерах па выпраўленьню памылак, дапушчаных комсамольскімі організацыямі, сьведчыць цэлы шэраг фактаў і дакумантаў.

Даклад Салтанава на лютаўскай нарадзе сэкратароў абкомаў і райкомаў, прамо а Косарава на маскоўскім пленуме абкому, закрыты цыркуляр, тэлеграма ЦК і рашэньні па дакладах цэлага шэрагу комсамольскіх організацый і, нарэшце, ЦК даў разгорнутую крытыку памылак мясцовых організацый на майскім пленуме. ЦК актыўным сваім умяшаньнем выпраўляў памылкі мясцовых організацый, у прыватнасьці ЦК папраўіў маскоўскі камітэт і шэраг іншых. Цэнтральны Камітэт рашуча ўдарыў па організацыях, якія нарабілі памылак і перагібаў, і прымусіў выправіць іх.

Але разам з тым я павінен сказаць, што калі ў асноўным перагібы і скажэньні выпраўлены, праўда яшчэ ня ўсюды, то цэлы шэраг організацый кінуліся ў другую крайнасьць і зараз не вядуць патрэбнай работы па колектывізацыі.

Ня мала ёсьць такіх ячэек КСМ і комсамольскіх работнікаў у раёнах і ячэйках, якія сустрэлі новы колгасны прыліў як гледачы, а не як кіраўнікі гэтага прыліву. У некаторых мясцох маюцца такія разважаньні, што пасьля зробленых перагібаў ніяк нельга ставіць пытаньне аб організацыі колектываў.

Я ня буду пералічаць прыкладаў, у мяне іх вельмі многа, калі вясковыя ячэйкі комсамолу не вядуць дастатковай масава-політычнай растлумачальнай работы па ўцягненьню ў колгасы сялянства, не вядуць дастатковай работы па колектывізацыі. Мы павінны біць па правым опортунізьме ў паасобных ячэйках комсамолу, якія не вядуць выстарчальнай работы па організацыі батракоў і беднякоў, не вядуць работы па колектывізацыі.

Мы павінны самым рашучым чынам паставіць пытаньне перад вясковымі організацыямі комсамолу, каб цэнтральным пытаньнем работы была колектывізацыя, каб кожная ячэйка павярнулася тварам да колгасаў, усяляк популярызуючы дасягненьні колгаснага і савгаснага будаўніцтва і на гэтым уцягвала новыя пласты ў колгасы.

І асабліва рашуча мы павінны патрабаваць ад комсамольцаў, каб яны ўступілі ў колгасы, асабліва ў раёнах суцэльнай колектывізацыі. У раёнах суцэльнай колектывізацыі комсамольцы ўсе пагалоўна павінны быць у колгасах.

ФЗВ, савгасвуч—асноўная форма падрыхтоўкі кадраў

Ажыцьцяўленьне павароту да пашыранага пэрыяду рэконструкцыі адзначае паварот ня толькі да гаспадарчых проблем, але і да проблем культрэволюцыі. Узрастаючыя тэмпы соц. будаўніцтва патрабуюць павышэньня пісьменнасьці ў краіне, павышэньня культ. узроўню працоўных. Ужо зараз недастатковая пісьменнасьць, недахоп тэхнічных, рабочых і інш кадраў зьўляецца вялікім тормазам у справе соцбудаўніцтва. Комсамол павінен у большай меры павярнуцца тварам да вырашэньня проблем культурнай рэвалюцыі. І ў першую чаргу павінна быць сконцэнтравана ўвага на пытаньнях перабудовы кадраў для рэконструктуемай сельскай гаспадаркі краіны. У барацьбе за кадры, за падрыхтоўку тэхнічна-пісьменных, політычна і культурна разьвітых будаўнікоў соцыялізму, творцаў і організатараў вытворчасьці і дзяржавы, ЦК УсеЛКСМ і ўвесь саюз меў зусім правільную і выразную лінію. УсеЛКСМ рашуча змагаўся за лінію партыі ў падрыхтоўцы кадраў, за соцыялістычныя прынцыпы працы і адукацыю моладзі. У барацьбе на два фронты.—як супроць перанясеньня капіталістычных прынцыпаў падрыхтоўкі кадраў. супроць фордызму, супроць вузкага рамесьніцтва, так і супроць схолястычнай, адарванай ад вытворчасьці школы,—вырас фабзавуч і шэраг іншых соц. форм падрыхтоўкі кадраў. Дабіліся зруху ў барацьбе за політэхнізм, за політычную школу.

У гэтай барацьбе супроць гасьцеўшчыны і супроць схолястычнай школы мы дабіліся агромністых посьпехаў. Партыя прызнала, што школа фабзавуч зьяўляецца асноўнай формай падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў і ўжо маецца бязумоўны зрух у справе падрыхтоўкі кадраў праз фабзавуч. Калі па прамысловасьці ВСНГ у 1928-29 г. мы мелі 71000 ахопленых гэтым відам навучаньня, дык у 1930 г. мы маем ужо 230 тыс. чал., а на 1931 г. будзе зноў прынята па прамысловасьці ВСНГ да 450.000 чал. А па ўсёй народнай гаспадарцы ў школы ФЗВ будзе прынята ня менш 750-800 тыс. чал. Трэба сказаць, што гэта зьяўляецца агромністым скачком уперад, у разьвіцьці лепшай соцформы адукацыі, якая адпавядае ўмовам і патрабаваньням пролетарскай дзяржавы і ў адносінах прынцыпаў соцыялістычнай організацыі працы і адукацыі.

Яшчэ поўнасьцю ня вырашана пытаньне ў адносінах кантрольных лічбаў набору ў ФЗВ у 1931 г. па ўсёй народнай гаспадарцы. Дзяржплян высоўвае лічбу 750-800 тыс. чал., а мы —ЦК КСМ—высоўваем лічбу да 1міл. 30 тыс. чал. Але я павінен сказаць, што многія організацыі не ўдзяляюць патрэбнай ўвагі пытаньням разьвіцьця і капітальнага будаўніцтва школ фабзавучу. Вы ведаеце з якім вялікім болем мы дасталі 51 мл. на капітальнае будаўніцтва школ ФЗВ ў мінулым годзе, а гэтыя грошы ў значнай меры ня былі выдаткаваны і вялікая колькасьць школ ня была пабудавана. Гэта гаворыць аб тым, што яшчэ многія гаспадарчыя і профсаюзныя організацыі, органы НКП—недаацэньваюць неабходнасьці хуткіх тэмпаў разьвіцьця фабзавучу, а таксама і паасобныя комсамольскія організацыі ня прынялі належных мер, не пракантралявалі і не дабіліся таго, каб адпушчаныя грошы на капітальнае будаўніцтва школ фабзавучу былі поўнасьцю выкарыстаны.

ЦК высоўвае лёзунг наблізіць вытворчае навучаньне ў школах фабзавучу непасрэдна к цэхам, бо там ёсьць лепшае абсталяваньне і там можна больш разгарнуцца ў сэнсе падрыхтоўкі кадраў праз школы фабзавучу.

Я павінен сказаць, што ў справе выкананьня рашэньняў партнарад па рэорганізацыі школ 2 ступені маюцца адпаведныя зрухі. Напрыклад, па РСФСР 50 проц. школ 2-й ступені рэорганізаваны ў тэхнікумы і школы сялянскай моладзі. Мы павінны дабіцца, каб ў бліжэйшы час усе школы 2 ступені былі поўнасьцю рэорганізаваны ў профшколы, ФЗС і школы колгаснай моладзі.

Трэба падкрэсьліць, што мы яшчэ недаволі змагаемся за організаваную падрыхтоўку кадраў для нашай сельскай гаспадаркі. Праўда, у сельскай гаспадарцы мы ня маем такога волыту, які мы маем у нашай прамысловасьці. Весьці рашучую барацьбу за савгасвуч, ШКМ супроць невыстарчальных тэмпаў іх разьвіцьця, за масавую падрыхтоўку сельскіх кадраў —важнейшая задача.

Неабходна таксама адзначыць, што мы дагэтуль ня маем належнага зруху ў галіне разгортваньня масавай дадатковай рабочай адукацыі. Мы раней, чым к канцу пяцігодкі, ня зможам дабіцца таго, каб школы ФЗВ ахапілі 60 проц. агульнай патрэбы ў рабочых кадрах. А нам патрэбны рабочыя і мы прымушаны будзем ужываць цэлы шэраг іншых форм падрыхтоўкі на падставе рашэньняў 16 партзьезду. Там сказана, што для ўсіх курсаў мы павінны дадаць агульна-політычныя і культур-адукацыю, мы павінны дапоўніць кароткатэрміновыя формы адукацыі за кошт культ. паліт. адукацыі. У гэтых адносінах мы павінны самым рашучым чынам падтрымліваць і разьвіваць сетку масавай дадатковай рабочай адукацыі. Мы павінны процiпаставіць гэтыя формы тым, якія не адказваюць соц. будаўніцтву—разьвіцьце дадатковай сыстэмы рабочай адукацыі, у першую чаргу школ рабочага юнацтва. УсеЛКСМ прарабіў вялікую работу ў справе рэорганізацыі ВУЗАЎ па вытворчаму прынцыпу, у адносінах арабочаньня ВУЗ'аў, ВТНУ і тэхнікумаў, а таксама пасылкі на вучобу комсамольскага складу.

У барацьбе за культурную рэволюцыю

Наступнае пытаньне аб разьвіцьці ФЗС і правядзеньні ўсеабучу. Партыя паставіла задачу правядзеньня ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучаньня і падвядзеньня пад ўсю нашу адукацыю політычнай базы ФЗС. Школы фабзавучу ў горадзе, савгасвуч і школы колгаснай моладзі на вёсцы. КСМ узяў шэфства над усеабучам. Мы прарабілі сёлета вялікую работу ў адносінах дапамогі органам НКАсьветы ў справе ахопу ўсеагульным пачатковым навучаньнем. Але разам з тым, мы тут яшчэ ня ўсё зрабілі і ў нас пакуль што маюцца яшчэ буйнейшыя недахопы. Мы ў ЦК слухалі даклад НКАсьветы РСФСР і НКАсьветы Беларускага і адзначылі цэлы шэраг буйных недахопаў у гэтых адносінах.

Барацьба за ўсеагульнае пачатковае навучаньне, за фабзавуч, 7-годку, за школу колгаснай моладзі, за савгасвуч, за політычную адукацыю, за хутчэйшую ліквідацыю няпісьменнасьці ёсьць барацьба за павышэньне агульнага ўзроўню культурнасьці і пісьменнасьці нашай краіны.

Ня гледзячы на паасобныя посьпехі, якія мы маем, у нас вельмі дрэнна стаіць справа з пытаньнямі культурна-бытавой работы. Нашы брыгады Цэнтральнага Камітэту, якія былі ў Донбасе, на трактарным заводзе, Магнітабудзе, на цэлым шэрагу іншых будаўніцтваў, гавораць аб тым, што комсамольскія організацыі не разгарнулі неабходнай работы па організацыі культурна-выхаваўчай работы, па організацыі новага быту.

На заводы ідуць новыя рабочыя ў большай частцы з вёсак, з дробна-бур

*) Працяг. Пачатак глядзі ў № 718.

ФОТО СА ЗЬЕЗДУ



Тав. Рындзіч перадае ад ЦК ЛКСМБ сьцяг Гомельскай піонэрскай організацыі



На зьлмку: Скразная комсамольская ўдарная брыгада аршанскага чыгуначнага вузла прывезла ў падарунак зьезду адрамантаваны паравоз. У овалах: зьверху—сэкратар Аршанскага РК КСМ тав. Лавіцкі, унізе—сэкратар камітэту чыгункі Воршы тав. Галкоўскі.

АБ РАБОЦЕ ЦК УсеЛКСМ

Даклад тав. Наумава

(Працяг)

жуазных пластоў гораду. Там вельмі моцна працуе клясавы вораг, вельмі шмат адсталых настрояў, маса яшчэ не перавыхавана, не пераварылася ў пролетарскім катле. Гэта яшчэ ня тая рабочая кляса, як, напрыклад, на старых нашых буйных заводах. У гэтых адносінах мы павінны сконцэнтраваць самую вялікую ўвагу на пытаньнях культурна-бытавой работы. Трэба наладзіць работу ў казармах за самыя істотныя патрабаваньні; організаваць падпіску на газэты, гуртковую работу, за чыстату, супроць бруду, тараканаў, вошаў і клапоў, за організацыю сталовак, за організацыю колектыўных агульнажыцьцяў, комун. У нас вялікае поле дзейнасьці,—за ліквідацыю няпісьменнасьці, за павышэньне пісьменнасьці ў малапісьменных і г. д. Тут мы павінны зрабіць больш таго, чым мы робім зараз.

У барацьбе за ўзьняцьце рэальнай заработнай платы і рабочага забясьпечаньня

У барацьбе з цяжкасьцямі на фронце забясьпечаньня мы павінны ўзмацніць сваю ўвагу у дапамогу размеркавальным органам, у дапамогу коопэрацыі па мобілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў. Многіх з недахопаў мы можам унікнуць калі мы найбольш актыўна возьмемся за пытаньні павышэньня рэальнай зарплаты, за організацыю жывёлагадоўчых саўгасаў, за організацыю прыгарадных гаспадарак, за вялікі кантроль і дапамогу коопэрацыйным органам, паасобным магазынам, за організацыю ў большай меры спаборніцтва і ўдарніцтва ў коопэрацыйных і загатоўчых органах. Гэтым мы зможам прынесьці вельмі вялікую карысьць у адносіне паслабленьня цяжкасьцяй, якія ёсьць у нас у справе забясьпечаньня.

Разам з профсаюзамі змагацца за палепшаньне экономічнага становішча рабочай моладзі

Асноўная лінія ў галіне палепшаньня экономічнага становішча рабочай моладзі—уцягненьне яе ў социялістычнае будаўніцтва, у першую чаргу ўцягненьне падрастаючай моладзі ў вытворчасьць. Мы з 122 тыс. чал. на 1 студзеня 28 году лік рабочых падлеткаў па прамысловасьці ВСНГ павялічылі да 400 тыс. чал. Мы ў асноўным ліквідавалі беспрацоўе сярод падлеткаў. У нас маецца на біржах працы 40 тыс. дзяўчат, якіх мы сёлета зможам уцягнуць у школы фабзавучу на вытворчасьці і ад беспрацоўя сярод падлеткаў у нас, у нашым Савецкім Саюзе, не застанецца і сьледу. У нас паўстае пытаньне аб плянавым уцягненьні падлеткаў з сямігодак, з пачатковых школ у школы фабзавучу.

У галіне аховы працы, у галіне палепшаньня экономічнага становішча рабочае моладзі, падлеткаў. мы маем таксама за гэты прамежак часу вялікія посьпехі. Вы ведаеце, што мы вялі жорсткую барацьбу з старым опортуністычным кіраўніцтвам профсаюзаў і Наркомпраці. Вы ведаеце, што Усе ЦСПС пад кіраўніцтвам т. Томскага вёў самую энэргічную атаку супроць комсамолу. Старое кіраўніцтва Усе ЦСПС усяляк імкнулася адапхнуць УсеЛКСМ ад уплыву на моладзь, старое кіраўніцтва УсеЦСПС вяло лінію на тое, каб адсеч моладзь ад актыўнай работы ў профсаюзах. Вынікам гэтага зьявілася з году ў год зьніжэньне колькасьці моладзі на актыўнай кіруючай рабоце ў профсаюзах і цэлы шэраг іншых буйных недахопаў абслугоўваньне моладзі, падлеткаў.

Вы ведаеце, што опортуністычнае кіраўніцтва профсаюзаў прашло міма соцспаборніцтва і ўдарніцтва, былі супроць нашых прынцыпаў социялістычнай організацыі працы і адукацыі, супроць фабзавучу, супроць цэлага шэрагу мерапрыемстваў, якія мы высунулі. На 8 зьезьдзе профсаюзаў опортуністычнае асабліва распасаліся і, ня гледзячы на нашыя настойлівыя патрабаваньні і крытыку работы профорганізацыі, выкліканыя буйнымі недахопамі ў рабоце профсаюзаў, опортуністыя з УсеЦСПС называлі нашу крытыку лёгка-кавалерыйскімі наскокамі, называлі нічым не абгрунтованай крытыкай і г. д. і г. д.

У барацьбе за лінію партыі ў профсаюзах комсамол таксама быў на перадавых позыцыях і дапамагаў партыі. Толькі пасьля зьмены опортуністычнага кіраўніцтва УсеЦСПС, ЦК саюзаў і Наркомпраці маецца значны зрух у галіне разгортваньня сумеснай работы па выкананьню рашэньняў партыі па соц. будаўніцтву, па абслугоўваньню і організацыі рабочай моладзі. Новае кіраўніцтва ўзяло лінію на падтрыманьне ўсіх добрых пачынаньняў комсамолу ў галіне вытворчай работы, узяло лінію на разьвіцьцё спаборніцтва і ўдарніцтва.

Усесаюзная нарада дала раз орнутую программу сумеснай работы за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за актыўнае ўцягненьне моладзі ў профработу, падрыхтоўку кадраў і, на гэтай аснове палепшаньне культурна-экономічнага становішча рабочай моладзі. У сумеснай рабоце профсаюзаў і УсеЛКСМ ёсьць шэраг дасягненьняў.

У гэту колдагаворную кампанію праводзіцца тарыфная работа зарплаты вучняў. Замена 6-ці разраднай сеткі 4-х разраднай тарыфнай сеткай. Пераход на 4-х разрадку павінен быць праведзен па ўсіх саюзах. Праўда, з-за недахопу сродкаў мы ня ўсюды поўнасьцю ажыцьцёвім сёлета намечаныя прынцыпы новай сеткі. У пастанове ЦК УсеЛКСМ указана на колькі процантаў і па якому саюзу падцягваецца зарплата вучняў.

У гэтую колдагаворную кампанію будзе значна ўпарадкавана становішча з аплатай падлеткаў—па-першае і па-другое, рашуча падцягнута заработная плата вучняў.

Нам патрэбна будзе самым уважлівым чынам актыўна ўдзельнічаць у колдагаворнай кампаніі.

Зараз працуе камісія пры Наркомпраці, якая пераглядае законадаўства аб працы моладзі і ўсё, што не адпавядае рэконструкцыйнаму пэрыоду, будзе адменена.

У бліжэйшы час будзе разглядацца на бюро ЦК і прэзыдыуме УсеЦСПС пытаньне, у сувязі з пераходам на 7 гадзінны рабочы дзень, аб скарачэньні рабочага дня падлеткаў.

Тым ня менш, ня гледзячы на зрух які маецца у галіне масавай экономічнай работы, я павінен сказаць, што шмат якія організацыі гэты вучастак работы не дацэньваюць.

Гэты недахоп мы павінны рашучым чынам ахіліць і разам з вялізарнай работай, якую мы вядзем ў галіне социялістычнага будаўніцтва, патрэбна весьці работу ў галіне культурна-экономічнай работы сярод рабочай моладзі. Прыцягваючы моладзь да социялістычнага будаўніцтва, мы павінны клапаціцца аб магчымасьці палепшань у нашых умовах матар'яльна-экономічнага становішча працоўнай моладзі Савецкага Саюзу.

Вось асноўныя пытаньні і асноўныя моманты нашае работы ў галіне ўдзелу ў социялістычным будаўніцтве і ў галіне вырашэньня проблемы культурнай рэволюцыі.

Якая асноўная ацэнка становішча нашага саюзу?

Асноўная ацэнка заключаецца ў тым, што комсамол дабіўся ў правядзеньні ў жыцьцё пастаноў ХУ зьезду партыі і УІІІ-га зьезду комсамолу вялікіх дасягненьняў.

Ці зрабілі мы паварот тварам да рэконструкцыі?

На гэтае пытаньне мы можам адказаць толькі станоўча. У асноўным паварот тварам да рэконструкцыйнага пэрыоду, да гаспадарчага будаўніцтва зроблен, і рашэньні 6-ай Саюзнай конфэрэнцыі і сьнежаньскага пленуму ЦК у асноўным выкананы. Аб чым гаварыў сьнежаньскі пленум ЦК? Ён адзначыў адставаньне тэмпаў работы УсеЛКСМ ад тэмпаў социялістычнага будаўніцтва і адставаньне кіраўніцтва ад новых задач, якія усталі ў рэконструкцыйны пэрыод. З якіх элемэнтаў складалася гэтае адставаньне? Комсамол у значнай меры жыў унутрысаюзнымі пытаньнямі, гаспадарчыя пытаньні ня былі асноўнымі ў рабоце УсеЛКСМ, у сілу гэтага комсамол не адбіваў у сваёй рабоце тэмпаў социялістычнага будаўніцтва і актыўнасьці перадавых слаёў моладзі, комсамол часта працаваў формамі і мэтодамі аднаўленчага пэрыоду.

Сьнежаньскі пленум ЦК адзначыў, што зьдзейсьненьне гэтага павароту, перамаганьне маючагася адставаньня, павінна ісьці па лініі павароту ўсёй масай членаў саюзу ў бок сапраўднага ўдзелу ва ўсіх галінах гаспадарча-культурнага будаўніцтва, падпарадкваючы ўсю работу, кожны крок свайго руху задачам хутчэйшага выкананьня пяцігодкі, задачам пабудовы социялізму.

Пленум папярэдзіў, што гэтае адставаньне, калі яно будзе працягвацца, вельмі небясьпечна. Ён сказаў, што калі організацыі комсамолу будуць плясьціся ў хвасьце хуткіх тэмпаў социялістычнага будаўніцтва, не аўладаюць патрэбным рэволюцыйным тэмпам і размахам сваёй работы, дык нават пры наяўнасьці формальна правільнай політычнай лініі перад намі будзе стаяць небясьпека спаўзаньня да опортунізму.

Ці зьяўляюцца зараз гаспадарчыя пытаньні асноўнымі ў рабоце організацыі комсамолу? Мы павінны проста сказаць, што гаспадарчыя пытаньні зьяўляюцца асноўнымі ў рабоце УсеЛКСМ. Ці дрэнна, ці добра, але ўсе організацыі комсамолу ў асноўным працуюць над гаспадарчымі пытаньнямі, у асноўным концэнтруюць увагу комсамолу на гэтай групе пытаньняў.

Мы зараз нашчупалі формы і мэтады работы ў рэконструкцыйны пэрыод, аб чым сьведчыць гэроічны прыклад у будаўніцтве, аб гэтым сьведчыць і цэлы шэраг дасканалых узораў работы, ды і само соцспаборніцтва і ўдарніцтва, якое ахоплівае ў прамысловых цэнтрах да 75 проц. і звыш комсамольцаў, зьяўляецца паказчыкам таго, што ў асноўным комсамол перабудаваўся, павярнуўся тварам да рэконструкцыйнага пэрыоду, што ён ужо зараз адышоў ад мэтадаў і форм аднаўленчага пэрыоду, ужо нашчупаў новыя формы і мэтады мобілізацыі мас, у значнай меры перабудаваўся прыстасавальна да сёнешніх умоў, да ўмоў пэрыоду рэконструкцыі.

У нас у саюзе маюцца людзі, якія ацэньваюць адставаньне, аб якім гаварыў сьнежаньскі пленум ЦК, як адставаньне хвасьціцкае. Я павінен сказаць, што з рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК гэта ніяк не выцякае. Пленум папярэдзіў толькі організацыі комсамолу, але не характарызаваў адставаньне хвасьціцкім. Комсамол і да сьнежаньскага пленуму ЦК меў цэлы шэраг дасягненьняў. Выходзячы з няправільнага разуменьня рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК, такія людзі працягваюць далей сваю „тэорыю": што „мы яшчэ павароту не зрабілі", „знаходзімся ў палосе павароту", „у палосе рашучага павароту" і г. д. Я павінен проста сказаць: калі-б мы зрабілі такую ацэнку, што мы знаходзімся толькі ў палосе павароту і ў асноўным ня справіліся з выкананьнем рашэньняў, пастаўленых сьнежаньскім пленумам ЦК, мы цягнулі-б саюз ня ўперад, а назад, орыентыравалі б саюз у бок выкананьня рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК, якія ў асноўным выкананы.

Шмат хто не разумее існасьці спрэчак аб павароце саюзу, спрачаюцца аб формулёўках—у якой меры і на колькі процантаў павярнуліся і ня бачаць усяе прынцыпова політычнае існасьці спрэчак. Чаму ЦК і саюз змагаюцца за тую ацэнку, што мы ў асноўным павярнуліся, што патрэбна орыентаваць саюз не назад, не на рашэньні сьнежаньскага пленуму ЦК, а на рашэньні 16 зьезду партыі? Ацэнка, што мы яшчэ не павярнуліся, азначае, што саюз не мобілізуецца, а наадварот, дэзорыентуецца, расхаладжваецца.

У нас ёсьць людзі ў саюзе, якія гавораць, што ў нас цяпер новае адставаньне. Гэтыя „тэорэтыкі" саюзнага руху гавораць, што вось партыйны зьезд паставіў новыя задачы, мы ад гэтых задач адстаем. Выходзіць так, што кожны новы год, кожны новы пэрыод будзе ставіць перад комсамолам усё новыя, больш складаныя задачы і мы заўсёды будзем адставаць. Гэтыя „тэорэтыкі" у саюзе прапаведваюць пэрманэнтнае адставаньне нашага саюзу. Я павінен проста сказаць, што гэтыя „тэорэтыкі" пэрманэнтнага адставаньня работы УсеЛКСМ глыбока памыляюцца цягнуць саюз у бок, саюз павінен адмовіцца і адмовіцца ад гэтых „тэорый", бо яны не мобілізуюць комсамол, не падымаюць у ім энтузіязму, а наадварот, дэзорыентуюць яго. Рабочы хлопец, які ўдарна працуе ў варштата, які ўкладае ўвесь свой энтузіязм, усю сваю ініцыятыву, актыўна змагаецца на фронце гаспадарчага будаўніцтва, скажа: „што за чорт, увесь час адстаём, ды адстаём, да ну яе к чорту, усё роўна будзем адставаць, а таму ня трэба сьпяшацца разгортваць работу".

Я павінен проста сказаць, што ўсе гэтыя „тэорыі" мы павінны самым рашучым чынам адвергнуць і сказаць, што саюз у асноўным зрабіў паварот.

Праўда, паварот адбываўся і адставаньне перамагалася няроўнамерна. Цэлы шэраг нашых вясковых організацый, дабіўшыся вялі іх посьпехаў, усё яшчэ не павярнуўся ў патрэбнай меры тварам да колгаснага будаўніцтва, не дабіўся патрэбных тэмпаў у рабоце комсамольскіх організацый на транспарце і некаторых іншых вучастках.

Я думаю, што наша ацэнка будзе правільная, яна не разыходзіцца з ацэнкай, якая дана комсамолу на 16 зьезьдзе партыі: „організацыі комсамолу і піонэраў перабудаваліся даволі пасьпяхова, дапасавальна да проблемы—тварам да вытворчасьці. Комсамол у апошні час падымае гэтую сваю работу на большую вышыню, ня толькі ў частцы ўдарнага руху, але і ў частцы рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў" (Кагановіч).

Тав. Сталін у сваім справаздачным дакладзе сказаў, што:—„Ленінскі комсамол і кіруемая ім рабочая моладзь увенчвае справу соцспаборніцтва і ўдарніцтва рашаючымі посьпехамі. Трэба прызнаць, што наша рэволюцыйная моладзь адыграла ў гэтай справе выключную ролю".

Рост і далейшыя задачы

Ленінскі комсамол вырас да 3 міл. чалавек. Калі да 8-га зьезду было два мільёны з лішнім, дык за гэты прамежак часу УсеЛКСМ вырас на 1 міл. чалавек. Асноўная частка нашага комсамолу—гэта дарослае рабочае юнацтва 17—23 год.

УсеЛКСМ значна вырас у адносінах пролетарскага ядра. Пролетарскае ядро ў цэлым вырасла з 42,7 проц. у 27 г. да 48,7 проц. Калі ўзяць паасобныя катэгорыі, дык лік батракоў вырас з 8,3 проц. да 13, рабочых—на 0,5 зьнізіўся, але цалкам пролетарскае ядро павялічылася, зьнізіўся процант іншых.

Я павінен адзначыць вельмі добрае зьявішча: у нас значна павялічыўся процант дзяўчат у КСМ—з 22,4 проц. да 26,5 проц.

І апошняе пытаньне, гэта—аб політычнай лініі ў галіне росту. Па-першае, 100 проц. ахоп рабочай моладзі заводаў, саўгасаў, пагалоўны ахоп батрацтва, шырокае ўцягненьне бядняцкай і перадавой колгаснай моладзі. Выходзячы з рашэньняў 16-га зьезду партыі, што колгасьнік зьяўляецца моцнай апорай партыі і савецкай улады на вёсцы, мы павінны пашырыць прыём за лік лепшых колгасьнікаў, у тым ліку і колгасьнікаў сераднякоў. Пад лепшым трэба разумець тых, хто актыўна ўзьнімае вытворчасьць працы, умацоўвае колгас, разгортвае соц. спаборніцтва, хутчэй усяго выжывае прыватна-уласьніцкую псыхолёгію. У раёнах суцэльнай колектывізацыі цалкам застаецца старая лінія—шырокае ўцягненьне бядняцкай моладзі. Папярэджваючы анты-серадняцкія настроі, якія маюцца ў паасобных організацыях, а таксама не дапушчаючы асераднячваньня ячэек мы павінны прымаць паасобных адданых партыі і савецкай уладзе сераднякоў, якія актыўна змагаюцца з кулацтвам за колектывізацыю.

Партпраслойка ў КСМ зьменшылася з 10.4 да 9.5 проц. У гэтых адносінах мы павінны прыняць меры. Ня ўжо ў нас няма добрых комсамольцаў? Я павінен сказаць, што мы ў гэтых адносінах ня выкарысталі ўсіх нашых магчымасьцяй. Парткіраўніцтва значна палепшылася, хаця яшчэ застаецца жадаць шмат лепшага, і ў асаблівасьці на вёсцы.

Піонэрская організацыя

8-мы зьезд адзначыў, што кіраўніцтва комсамолу піонэрскай работай было нездавальняючым. 6 Усесаюзная конфэрэнцыя констатавала, што ў гэтых адносінах пералому ўсе яшчэ няма. Як зараз? За гэты прамежак часу некалькі палепшылася кіраўніцтва КСМ піонэрскай організацыяй, але ў асноўным вялікіх дасягненьняў мы ня маем. Хаця наша піонэрская організацыя вырасла ў 4-мільённую армію, мы павінны самым рашучым чынам дабівацца, каб кожны райком комсамолу прымаў усе меры палепшыць кіраўніцтва рухам. Нашы піонэрскія організацыі павінны зьяўляцца організатарамі ўсёй дзетвары. Працягваць лінію на тое, каб піонэрская організацыя яшчэ больш актыўна дапамагала партыі і комсамолу ў выкананьні задач социялістычнага будаўніцтва. Я магу прывесьці шмат фактаў аб тым, што піонэрская організацыя дапамагала нам змагацца з прагуламі, п'янствам, спазьненьнямі на работу. Піонэры вельмі часта бралі сваіх бацькоў на буксір, прымалі меры, каб выжыць прагулы, пьянства і інш. Піонэры вельмі многа дапамаглі нам у галіне социялістычнага будаўніцтва, у барацьбе за выкананьне прамфінплянаў.

Піонэрорганізацыя павінна яшчэ больш рашуча весьці барацьбу за політэхнізацыю, за ўсеагульнае навучаньне, за разьвіцьцё ФЗВ і ШКМ. Спынюся крыху на пытаньні аб дзяцях кулакоў, бо са мной многа таварышоў аб гэтым гаварылі. У нас маецца ў паасобных ячэйках і ў паасобных таварышоў мяккія спачувальныя адносіны да дзяцей кулакоў. Ёсьць такія развaжаньні, што дзеці кулакоў таксама павінны прымацца ў піонэрскія атрады, мы павінны больш клапаціцца аб тым, каб ахапіць працоўную дзетвару—сюды ўвага. Ёсьць частка таварышоў-работнікаў, якія думаюць як быць: прымаць дзяцей кулакоў ці ня прымаць. Работу па разлажэньню кулацкай сям'і, па перавыхаваньню дзяцей, па далучэньню к працоўным звычкам і г. д. мы абавязаны весьці, але гэта яшчэ не азначае абавязкова прымаць і расчыняць дзьверы. Выключэньні могуць быць, але ня сюды трэба концэнтраваць увагу, а на ахоп у бліжэйшы час новых мільёнаў дзетвары працоўных ў піонэры.

Падпарадкаваць кожны свой крок будаўніцтву соцыялізму

Якія нашы задачы на будучыню? Гэтыя нашыя пэрспэктывы разьвіцьця прадвырашаны і вызначаны рашэньнямі XVI парт. зьезду. Асноўныя вехі шляхі разьвіцьця УсеЛКСМ, як галоўнага дапаможніка партыі, вынікаюць з задач пастаўленых партыяй: социялістычнае наступленьне па ўсім фронце, далейшае павялічэньне тэмпаў індустрыялізацыі краіны, колектывізацыі сельскай гаспадаркі і, на падставе правядзеньня суцэльнай колектывізацыі,—ліквідацыя кулацтва як клясы. Калі мы раней наступалі на паасобных вучастках на капіталістычныя элемэнты, дык зараз наш лёзунг разгорнутае наступленьне па ўсім фронце. УсеЛКСМ павінен так разгортваць сваю работу, каб замацаваць дасягнутыя посьпехі, выраўняць фронт работы ўсіх організацый комсамолу, яшчэ больш урасьці ў глыбінныя пытаньні рэконструкцыі народнай гаспадаркі, поўнасьцю аўладаць тэмпамі на ўсіх важнейшых вучастках будаўніцтва. Далей павышаць політычнае значэньне і ролю комсамолу, як галоўнага дапаможніка партыі па разгортваньню социялістычнага будаўніцтва, па масаваму комуністычнаму выхаваньню працоўнай моладзі, працягваючы павышаць організуючае значэньне комсамолу ў гэтых адносінах.

Задачы комсамолу ў вытворчасьці

Дзеля гэтага мы павінны падняць удзел саюзу ў грамадзкім культурным, політычным, дзяржаўным жыцьці краіны—на вышэйшую ступень вырашэньня больш складаных задач, сконцэнтраваўшы ўвагу на важнейшых вузлавых вучастках социялістычнага будаўніцтва.

Якія-ж гэта вучасткі? Гэтыя вучасткі такія: Непаслабная ўвага індустрыялізацыі нашай краіны, увага металюргіі, таму што наша краіна перажывае голад у мэталі; электрофікацыя нашай краіны, апалу (вугаль, нафта, торп і інш. віды апалу нашай гаспадаркі), потым машынабудаўніцтву, якое зьяўляецца важнейшым вучасткам, неабходным для індустрыялізацыі нашай краіны, хэмічнай прамысловасьці.

Затым мы павінны дапамагчы партыі вывесьці наш транспарт з вузкага месца, сконцэнтраваўшы ўвагу ўсіх нашых комсамольскіх організацый на пытаньнях транспарту, на барацьбе за рацыяналізацыю транспарту і барацьбе за працоўную дысцыпліну. Ак

СЯБРОЎСКІ ШАРЖ

ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА СЬВІНАГАДОЎЛІ

Адна комсамолка не хацела пайсьці на працу па сьвінагадоўлі, кажучы, што яе замуж ніхто ня возьме, калі яна будзе сьвінаркай. (З прамовы тав. РУДНІЦКАГА)

ПАВАРАЧВАЕ...

АБ РАБОЦЕ ЦК УсеЛКСМ

Даклад тав. Наумава

(Працяг)

...я таго, вузлавое пытаньне, якое стаіць перад намі, гэта—вырашэньне Урала-Кузбаскай проблемы. Гэтае пытаньне зьяўляецца пытаньнем рабочае моладзі і комсамольскіх організацый, і мы павінны ўсяляк мобілізаваць моладзь на дапамогу Уральскаму і Сібірскаму комсамолу ў стварэньні новай вугальна-мэталюргічнай базы на ўсходзе. [illegible] чужаземнай тэхнікі. У гэтых адносінах у нас яшчэ шмат незахопаў. Калі ўзяць Сталінградзкі трактарны завод, [illegible] ў амэрыканскіх абставінах, неасвоенасьці тэхнічнай [illegible] пашкоджаны машыны на 1 млн. руб. Сталінградзкі трактарны завод складаецца выключна з моладзі. Калі возьмем [illegible] завод, дык ён таксама ў значнай ступені складаецца з моладзі. Мы павінны на сапраўдным, як сьлед, мобілізаваць комсамол на павышэньне тэхнічнай пісьменнасьці, асваеньне з перадавай, чужаземнай тэхнікай, трэба шырока выкарыстаць ініцыятыву комсамольцаў і рабочай моладзі ў гэтым напрамку.

Каб забясьпечыць неабходны тэмпы ўдзелу УсеЛКСМ у соцыялістычным будаўніцтве, трэба ахапіць поўнасьцю комсамол і дабівацца максымальнага ахопу моладзі соцыялістычным спаборніцтвам. Комсамол вялікі [illegible] гэтага мала, і нас тут вялізарнае поле дзейнасьці і мы павінны падаваць нашу работу так, каб дапамагчы хутчэй рацыяналізаваць нашы заводы.

Задачы комсамолу ў вёсцы

Усёй сваёй работай комсамол павінен дабівацца пашырэньня сыравіннай базы, развіцьця тэхнічных культур, [illegible] магчымасьць яшчэ больш павялічыць тэмпы лёгкай прамысловасьці і ў прыватнасьці выпрацоўку прадметаў шырокага спажываньня.

Вырашэньне жывёлагадоўчай проблемы зьяўляецца галоўнейшай умовай для далейшага разгортваньня нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

У галіне перабудовы сельскай гаспадаркі наша задача, выходзячы з рашэньня сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК, у тым, каб на 3-ці год пяцігодкі ахапіць ня менш паловы ўсіх сялянскіх гаспадарак уцягнуць у колгасы, а ў збожжавых раёнах давесьці гэты процант да 80. Такая дырэктыва нашай партыі ў галіне колектывізацыі сельскай гаспадаркі выходзіць з [illegible], якіх мы дабіліся, на падставе якіх мы павінны разгортваць далейшую колектывізацыю вёскі. Накіраваць сваю ўвагу на ўмацаваньне і разгортваньне савгасаў, на організацыю і ўмацаваньне машынна-трактарных станцый, на экономію паліва, на [illegible] адносіны да сельска-гаспадарчых машын і ў першую чаргу да трактару. Ня гледзячы на тое, што у савецкай краіне трактар працуе больш, чым [illegible] амэрыканскія трактары таму, што наш трактар працуе на савгасна-колгасных палёх, мы ўсё-ж маем вельмі многа [illegible] пасьля кожнай пасяўной кампаніі большая частка трактараў [illegible]. Мы павінны навучыць [illegible] адносіцца да машын, да трактароў. [illegible]

[illegible]

Прыкласьці ўсе сілы і энэргію на выкананьне програмы рашаючага

Нашы пэрспэктывы на бліжэйшы год патрабуюць ад нас прыкласьці ўсе свае сілы, увесь энтузіязм, актыўнасьць, самадзейнасьць, каб намечаны бальшавіцкі прамфінплян на 3-ці, рашаючы год пяцігодкі, які канчаткова падводзіць соцыялістычную базу пад экономіку нашай краіны,—быў выканан. Дабіцца таго, каб 17 міярдаў рублёў капіталаўкладу ў 3-ці год пяцігодкі былі асвоены нашай краінай.

Даць прырост прамысловасьці ня менш, чым на 45 проц., якія намечаны сьнежаньскім пленумам ЦК і ЦКК, і якія намечаюць сэсіяй ЦВК Саюзу ССР, дабіцца каб вытворчасьць працы павысілася ня менш чым на 28 проц., зьнізіць сабекошт ня менш чым на 10 проц. па прамысловасьці. Рашуча палепшыць якасьць продукцыі.

Вось асноўныя, важнейшыя лічбы на 3-ці год пяцігодкі, за якія мы павінны змагацца на перадавых позыцыях таксама як змагаліся за гэтыя 2 з паловай гады.

На конкрэтных справах апраўдаць гонар шэфа

ЦК УсеЛКСМ узяў шэфства над электрыфікацыяй. Выходзячы з гэтага, паставіць гістарычныя задачы перад нашым КСМ, у ажыцьцяўленьні якіх мы павінны дапамагчы партыі і ураду. Электрыфікацыя—важнейшы участак нашага соцыялістычнага будаўніцтва. [illegible] шкоднікі [illegible] сваю шкодніцкую работу ў першую чаргу на зрыў электрыфікацыі нашай краіны, [illegible] шкодніцтва ішло ў кірунку зрыву будуючыхся нашых буйнейшых электростанцый, бо яны зьяўляюцца асноўным рычагом у рэконструкцыі нашай краіны. Мы павінны ў галіне шэфства над электрыфікацыяй у самы бліжэйшы час ліквідаваць усе вынікі шкодніцтва. Узяць пад свой кантроль нагляд за будаўніцтвам электростанцый, разгарнуць работу ў гэтых адносінах у першую чаргу для электрыфікацыі краіны. Мы апраўдалі сваё шэфства над флётам, апраўдаем узятае шэфства над [illegible]. Мы павінны з большай энэргіяй апраўдаць узятае шэфства над электрыфікацыяй краіны. Я думаю, што ленінскі комсамол падрыхтуе гэтую пастанову ЦК, і мы не на словах, а на справе, дапаможам партыі электрыфікаваць нашу краіну ў самы кароткі час, прыклаўшы ўсе сілы нашых комсамольскіх організацый на гэтым участку.

Задачы кіраўніцтва

Посьпехі, якіх мы дабіліся ў соцыялістычным будаўніцтве, зьяўляюцца таксама вынікам таго, што мы ў значнай ступені ў організацыйных адносінах перабудаваліся і дабіліся лепшага кіраўніцтва, лепшай падбудовы організацыйнай нашай работы УсеЛКСМ, якая садзейнічала лепшай мобілізацыі комсамольцаў і працоўнай моладзі на гаспадарчы фронт. Трэба сказаць, што мы рэорганізавалі наш апарат камітэтаў комсамолу, у тым ліку і ЦК КСМ, формы і мэтоды работы ўсяляк імкнуліся прыстасаваць да рэконструкцыйнага пэрыоду. У гэтым кірунку мы кой-чаго дабіліся. Організацыйная перабудова садзейнічала таму, што мы ў асноўным зрабілі паварот тварам да гаспадарчага будаўніцтва. Аб гэтым сьведчыць рост ініцыятывы і самадзейнасьці, рост ударнага руху ў нашай комсамольскай рабоце, прыцягненьне бясплатнага актыву да работы камітэту комсамолу, організацыя добраахвотных брыгад, потым ёсьць ня мала камітэтаў, якія ў сваёй рабоце прыцягваюць спэцыялістых—інжынэраў, аграномаў, навуковых работнікаў—і тым самым робяць больш кваліфікаваным сваё кіраўніцтва. Мы прарабілі вялікую работу ў адносінах умацаваньня раёнаў у сувязі з ліквідацыяй акруг і ў адносінах умацаваньня цэху, зьвяна, групы і брыгады, групы на заводзе і фабрыцы.

Вы ведаеце, што Цэнтральны Камітэт комсамолу ўзяў пад свой непасрэдны нагляд разьмеркаваньне акруговых работнікаў. Цэнтральны Камітэт пастанавіў 90 проц. акруговых работнікаў перакінуць на работу ў раёны. Мы заслухалі амаль усе буйныя організацыі на бюро Цэнтральнага Камітэту, ацьвярджалі сьпіс, разьмяркоўвалі перакідаемых работнікаў, абсолютная большасьць акруговых работнікаў у нас працуе на раёне.

(Голас з месца:—Колькі процантаў?)

Дакладнага проценту ў мяне няма, але ў кожным разе гэтая лічба блізка к тэй наметцы, якую мы далі, хаця поўнасьцю мы гэтай справы ня выканалі.

(Голас з месца:—на Беларусі слаба).

Тады вы выступіце ў спрэчках і пакрыйце свой ЦК за тое, што ён слаба гэта організаваў.

Цэнтральны Камітэт зрабіў вялікую справу ў адносінах умацаваньня вёскі работнікамі. Як вы ведаеце, мы правялі мобілізацыю 500 актыўных кіруючых комсамольскіх работнікаў з прамысловых раёнаў на сэкратароў вясковых райкомаў. Я яшчэ ня гутарыў з вашымі пяцісотнікамі, ня гутарыў з хлопцамі, як тут нашы пяцісотнікі працуюць, але я быў на абласной конфэрэнцыі ў ЦЧО, там агульны малюнак такі, што нашы пяцісотнікі робяць вялікую справу для падняцьця ролі і значэньня вясковых організацый комсамолу, што пяцісотнікі зьяўляюцца перадавой часткаю актыву і нядрэнна заварачваюць комсамольскай работай. Я думаю, што гэта ня толькі малюнак ЦЧО і іншых некаторых абласьцей,—гэта агульны малюнак Саюзу. Мы сапраўды, за некаторым выключэньнем, далі добры склад пяцісотнікаў і яны вельмі здорава дапамагалі і дапамагаюць нашым організацыям комсамолу ў разгортваньні работы.

Акрамя таго, мы правялі курсы на 500 чал. па перападрыхтоўцы сэкратароў вясковых РК. Гэта таксама вялікі ўклад у падрыхтоўку нашых кіруючых кадраў.

Але, разам з гэтым, у галіне організацыйнай работы мы маем буйныя недахопы, якія мы павінны ўсяляк прааналізаваць і ўнікаць на будучы час. Па-першае, мы часта раскідаемся, ня можам згуртаваць удару на асноўным важным вучастку нашага будаўніцтва, нашай работы. Па-другое, мы часта ня можам сваечасова і хутка падняць і організаваць для вырашэньня той альбо іншай рашаючай задачы, актыўнасьць усёй моладзі, усіх комсамольцаў. Трэба так будаваць сваю работу, каб кожны комсамолец быў актыўным удзельнікам на фронце будаўніцтва. Цяпер мала сказаць, што ячэйка нядрэнна працуе, а мы павінны пагледзець як пэрсанальна кожны комсамолец працуе ў галіне гаспадарчага будаўніцтва, трэба перайсьці да пэрсанальнага кантролю над работай комсамольцаў, гэтым мы пацягнем усе нашы адстаючыя рэзэрвы, каб перакінуць іх на фронт барацьбы за прамфінплян, за гаспадарчае будаўніцтва, на вырашэньне організацыйных задач. Аўторытэт, роля і значэньне комсамолу вельмі здорава ўзрасьлі. Але організацыйна мы гэтую актыўнасьць замацоўваем невыстарчальна. Недастаткова рахуемся, вельмі слаба перадаем у партыю нашых энтузіястых, ударнікаў. Гэтыя недахопы мы павінны выправіць.

Трэба сконцэнтраваць увагу ячэйкі на пытаньнях пляніраваньня, рацыяналізацыі, каб ня толькі займацца пытаньнем як колькасна прамфінплян мы выканалі, але каб ячэйка комсамолу сачыла за якасьцю прадукцыі, каб ячэйка комсамолу сачыла за зьніжэньнем сабекошту, каб перабудавалася, мобілізавала моладзь па рацыяналізацыю ў цэху, у заводзе машынна-трактарнай станцыі, колгасе; правільна раставіць сілы на важнейшыя вучасткі,—гэта першая і неабходная ўмова для выкананьня прамфінпляну. У гэтых адносінах трэба многае зрабіць.

Наша асноўная лінія—гэта лінія на разьвіцьцё ініцыятывы і самадзейнасьці, разьвіцьцё работы ініцыятыўных груп, пабудова работы такім чынам, каб яна дапамагла разьвіцьцю добраахвотніцтва, самадзейнасьці паасобных комсамольцаў, самадзейнасьці ў саюзе і ў асяродзьдзі тых, якія працуюць звакол комсамольскіх ячэек. Гэта асноўная лінія.

Два словы аб кіруючых кадрах. Бязумоўна, кіруючыя кадры значна вырасьлі. Політычны ўзровень нашага актыву бясспрэчна павысіўся. І сэкратары раённых камітэтаў і абласны актыў і сэкратары ячэек,—гэта ўжо больш паваротлівы народ, які кой-чаму навучыўся, які загартаваўся ў барацьбе, навучыўся як лепш на асноўе ініцыятывы і самадзейнасьці організаваць работу, навучыліся падхопліваць ініцыятыву паасобных комсамольскіх перадавых ячэек.

Ня гледзячы на гэта ў нас яшчэ маецца цэлы шэраг недахопаў: няўменьне раённых камітэтаў і іншых камітэтаў комсамолу так сконцэнтраваць сваю ўвагу, каб яна была накіравана на галоўнейшыя організацыі, у першую чаргу прамысловыя організацыі, організацыі раёнаў суцэльнай колектывізацыі, організацыі жывёлагадоўчых раёнаў, раёнаў сыравіны і тэхнічных культур і г. д. Кожны райком павінен сконцэнтраваць сваю ўвагу, па-першае, на заводах, савгасах, машынна-трактарных станцыях, колгасах, у першую чаргу буйнейшых колгасах.

І потым, таварышы, мы павінны ўсяляк разгортваць бальшавіцкую самакрытыку. Гэтая асноўная ўмова ў барацьбе з усімі недахопамі, гэта асноўная ўмова ў барацьбе з усімі скажэньнямі лініі партыі, гэта асноўная ўмова для мобілізацыі ўсіх комсамольцаў на выкананьне рашэньняў і пастаўленых задач. Бальшавіцкая самакрытыка павінна быць як ніколі яшчэ ў большай меры разгорнута і па собныя спробы зажыму самакрытыкі альбо спробы ўмаліць яе значэньне, павінны быць перасечаны ў корні. Самакрытыка павінна быць асноўным мэтадам у кіраўніцтве і рабоце.

Пад кіраўніцтвам партыі да новых перамог

Вялізарныя посьпехі, якія атрымаў наш комсамол за гэтыя 2 з палов. гады, у асноўным зводзяцца да таго, што комсамол правільна, па бальшавіцку знайшоў мэтады і формы работы ў паласу рэконструкцыйнага пэрыоду.

Вось тыя асноўныя моманты работы саюзу па выкананьню пастаноў партыі, у прыватнасьці 16 партзьезду і 8 зьезду саюзу, вось тыя вялізарныя задачы, якія выцякаюць для нашага комсамолу на будучы час і з рашэньняў 16 партзьезду.

УсеЛКСМ павысіў сваю ўдзельную вагу, вырас політычна, пашырыў уплыў на рабоча-сялянскую моладзь. Ён ёсьць ў галоўным памочнікам партыі. Ён цалкам застаўся вядучай сэкцыяй Кім'у.

Ніколі УсеЛКСМ ня быў такім монолітным, згуртаваным у політычных і організацыйных адносінах, як ён ідзе к свайму 9 зьезду саюзу. Але і растуць і задачы, ускладняюцца, усе больш і больш грандыёзныя пляны і магчымасьці устаюць перад партыяй, краінай і УсеЛКСМ. У паласу разгорнутага наступленьня па ўсяму фронту, у паласу абвостранай клясавай барацьбы за хуткія тэмпы індустрыялізацыі краіны і колектывізацыі сельскай гаспадаркі комсамол будзе і павінен быць па ранейшаму на перадавых позіцыях, змагаючыся самым энэргічным чынам за лінію партыі з усімі адхіленьнямі. Абвостраная клясавая барацьба, якая павялічвае нападкі з боку правых і „левых“ опортуністых на партыю, прымушае нас яшчэ больш жорстка змагацца за генэральную лінію партыі, за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, прымушае нас яшчэ больш жорстка змагацца за тыя прамфінпляны, якія мы вызначылі, за ўмацаваньне абароназдольнасьці нашай краіны.

Небясьпека новай вайны навісла над сьветам, трэба ўпарта і настойліва рыхтавацца да абароны.

Я павінен сказаць, што ў нас тут ёсьць вялікія посьпехі, але яны яшчэ недастатковы. Хаця армейскі комсамол мае ўся вялікіх посьпехаў, але ў грамадзянскіх організацыях мы вялікіх посьпехаў у гэтых адносінах яшчэ ня маем. У Далёка - ўсходніх падзеях, якія былі з Кітаем, нашы чырвонаармейцы — комсамольцы вытрымалі політычны экзамен. 17 комсамольцаў—чырвонаармейцаў узнагароджаны Рабоча-Сялянскім урадам за Далёка - Усходнія падзеі ордэнам Чырвонага Сьцягу (воплескі).

Гэта зьяўляецца лепшай гарантыяй таго, што у будучых баёх, што ў будучай вайне комсамол, маладыя чырвонаармейцы будуць таксама на вышыні свайго становішча. Калі мы яшчэ ў большай меры ўзьнімем сваю работу ў нас у грамадзянскіх організацыях, гэта будзе лепшай гарантыяй таго, што комсамол не забыў і не забудзе тых традыцый, якія мы мелі ў баёх грамадзянскай вайны. Калі комсамол на VIII зьезьдзе Саюзу ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сьцягу за баявыя заслугі на фронце грамадзянскай вайны, на фронце аднаўленьня разбуранай гаспадаркі нашай краіны, дык гэта ордэн Чырвонага Сьцягу ня толькі ня страціў свайго бляску, а ён па ранейшаму ярка гарыць на грудзі Ленінскага комсамолу і кліча ўперад на вырашэньне агромністых задач, якія пастаўлены перад намі партыяй.

Ленінскі комсамол ідзе к свайму IX зьезду, уступаючы ў 3-ці год пяцігодкі, як ніколі згуртаваны, аднадушны і ў організацыйных і політычных адносінах. Гэта зьяўляецца лепшай гарантыяй таго, што Саюз на правільным шляху, што Цэнтральны Камітэт вядзе ўвесь саюз па шляху хуткай індустрыялізацыі краіны, правільна мобілізуе на барацьбу за лінію партыі за пабудову соцыялізму ў самы кароткі, мінімальна гістарычны тэрмін (бурныя аплёдысмэнты).

Мы ўпэўнены ў свае перамогі

Х-му зьезду ленінскага комсамолу Беларусі

З глыбокага падпольля, ад імя комсамоліі Заходняй Беларусі, шлём Х-му зьезду Ленінскага комсамолу Беларусі шчырае комсамольскае прывітаньне. Мінула ўжо 10 год з таго часу, як мы, гвалтам адлучаныя ад Вас польскім імпэрыялізмам, і адасобленыя ад Вас, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і КСМ Польшчы і КІМ'у, у нязьмерна цяжкіх варунках, вядзем барацьбу з белапольскай крывавай окупацыяй.

Мы ні на хвіліну не запамяталі тых рэволюцыйных традыцый Кастрычніка на Беларусі, калі ў адзіных з вамі шэрагах з аружжам у руках, пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі Літвы і Беларусі, змагаліся за поўнае вызваленьне ўсіх працоўных і працоўнай моладзі.

Многіх ужо няма ў нашых шэрагах. Тых, хто разам з намі будаваў комсамол Літвы і Беларусі, хто разам з Вамі ішоў на сьмерць за Савецкую Беларусь. Яны загінулі ад крывавай рукі белапольскага окупанта пад Вільняй у 1920 годзе, у партызанскіх баёх у 1923—25 г. г. Тысячамі загінулі ў катоўнях дэфэнзывы, на допытах, яны дзесяткамі перастраляны на дэмонстрацыях, забастоўках і экзэкуцыях. Палова ўсёй нашай організацыі гніе зараз у фашысцкіх турмах.

На Заходняй Беларусі сёньня, як ніколі, бушуе крывавы тэрор фашызму ў рознастайных формах карных экспэдыцый, масавых арыштаў і забойстваў, катаваньняў, падатковага цяжару, нацыянальнага зьдзеку і гвалту. Фашысцкая дыктатура, у саюзе з беларускай буржуазіяй і кулацтвам, пры актыўнай дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстых—Луцкевіча, Астроўскага і К°, у саюзе з беларускімі нац. дэмократамі БССР, а таксама ўсіх соцыял-фашысцкіх і народніцка-фашысцкіх партый, ліхаманкава рыхтуе ўзброены напад на СССР, каб задушыць першую ў сьвеце бацькаўшчыну пролетарыяту і працоўных мас, а БССР абярнуць у колёнію польскага імпэрыялізму. Дзеля гэта прагне польскі фашызм у першую чаргу фізычна зьнішчыць комуністычную партыю і КСМ, каб разьбіць рэволюцыйна-нацыянальна-вызваленчы рух, які ў адзіным рэволюцыйным фронце пролетарыяту і працоўных усёй Польшчы ўстрасае падваліны панаваньня польскага фашызму і пагражае пролетарскай рэволюцыі.

Фашысцкая дыктатура хоча мець разьвязаныя рукі для ўзброенага нападу на СССР, каб разбурыць соцыялістычнае будаўніцтва. Мы непахісны. Згуртоўваючыся ў штодзённым змаганьні за генэральную лінію партыі, у барацьбе на 2 франты, супроць правых, галоўнай небясьпекі, і супроць „левых“ фразёраў, а таксама супроць адкрытых ворагаў-беларускіх нац. фашыстых—агентуры і апоры фашысцкай окупацыі, з усімі маладзёжнымі фашысцкімі організацыямі, з падрыхтоўкай антысавецкай імпэрыялістычнай вайны,—мы рыхтуемся да таго, каб ператварыць гэтую вайну, калі яна паўстане, у вайну грамадзянскую. Мы непахісны ў клясавай барацьбе за чырвоны Кастрычнік. Ня гледзячы на ўдары фашызму, нашы шэрагі з кожным днём растуць і мацнеюць.

Мы з гонарам сочым за вашай барацьбой і вялізарнымі посьпехамі ў справе індустрыялізацыі савецкай Беларусі, разгортваньні нацыянальна-культурнага будаўніцтва, колектывізацыі сельскай гаспадаркі, на базе якой ліквідуецца кулацтва, як кляса. Мы перакананы, што ўжо хутка надыйдзе час, калі мы з Вамі будзем у адзінай сям'і будаваць соцыялізм на вызваленай Заходняй Беларусі аб'яднанай ў Савецкую Беларусь!

Няхай жыве Х-ы зьезд Ленінскага комсамолу Савецкай Беларусі!

Няхай жыве ЛКСМ Заходняй Беларусі!

Няхай жыве КІМ!

Няхай жыве УсеКП(б)!

Няхай жыве Комінтэрн—штаб сусьветнай рэволюцыі!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнага Саюзу Моладзі Заходняй Беларусі.

ВЕРНЫ ТРАДЫЦЫЯМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА

ЛКСМБ у непрымірымай барацьбе з правым і „левым" опортунізмам як у тэорыі, так і на практыцы, загартаваўся для яшчэ больш упартай барацьбы за генэральную лінію партыі, зьдзейсьніўшы ў асноўным паварот тварам да задач гаспадарчага будаўніцтва

Замацаваць дасягнутыя посьпехі, палепшыць кіраўніцтва раёнамі і ячэйкамі, змагацца за выкананьне пляну конкрэтных дзеяньняў комсамолу

З спрэчак па дакладу тав. Палякова

Вячэрняе паседжаньне зьезду 9-га студзеня было прысьвечана спрэчкам па дакладу тав. Палякова. Выступіўшы ў спрэчках тав. Галкоўскі (Ворша) зьвярнуў увагу зьезду на вузкае месца ў працы комсамольскай організацыі — на транспарт. Мы ведаем,—кажа ён,—што транспарт мае асабліва вялікае значэньне ў нашай народнай гаспадарцы. Але мы яшчэ не навучыліся расстаўляць нашы сілы так, каб зьвішчаць вузкія месцы ў рабоце, каб лепш рэагаваць на тыя альбо іншыя хваравітыя бакі. ЦК комсамолу недастатковую ўвагу ўдзяляў транспартным ячэйкам.

На Аршанскім вузьле,—кажа далей тав Галкоўскі,—была праяўлена права-опортуністычная практыка з боку партыйнага колектыву і вучастковага камітэту саюзу. Комсамольскі камітэт своечасова завастрыў па гэтым увагу. У апошні час праца Аршанскага вузла некалькі палепшана.

Далей тав Галкоўскі спыняецца на становішчы з політ-вучобай. Політвучоба стаіць не на належнай вышыні. Разам з гэтым дрэнна пастаўлена беларусізацыя, а ў гэты час ЦК прысылае падручнікі на расійскай мове.

Тэорыя махровага опортунізму

Тав. Бэтхэр.—ЦК УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМБ далі ацэнку нашай організацыі, што яна ў асноўным павярнулася тварам да вырашэньня гаспадарчых пытаньняў. Зараз выступаў тав. Шурыц. Мне здаецца, што тав. Шурыц ня ведае становішча вясковых ячэек і задач колгаснага будаўніцтва і працягвае опортуністычную тэорыю, якая выяўляецца ў недаацэнцы вясковага комсамолу.

Адносна нашага росту. У 1928-29 годзе мы вырасьлі на 1.466 чалавек, а за 9 месяцаў 29-30 году мы ўжо маем рост у 2.774 чал. Няўжо гэта не работа комсамолу? Гэты рост нашай організацыі сьведчыць аб тым, што комсамольская організацыя на вёсцы праводзіла значную работу.

Тав. Сянкевіч.—Конкрэтныя факты і прыклады прыведзеныя сёньня на зьезьдзе сьведчаць аб тым, што вясковы комсамол спраўляецца з сваімі задачамі, што ёсьць пэўны паварот да пытаньня перабудовы сельскай гаспадаркі. Комсамольцы часта зьяўляюцца зачыншчыкамі організацыі колгасу, дзякуючы комсамольцам іх бацькі ўступаюць у колгас. Моладзь зьяўляецца прыкладам у барацьбе за організацыю і замацаваньне колгасу.

Больш увагі організацыі працы ў колгасах

Тав. Цярэнцяў.—Установка ЦК аб тым, што наша організацыя ў асноўным павярнулася тварам да вытворчасьці бязумоўна верная. Але побач з вялікімі посьпехамі ў гэтай галіне, у паасобных зьвеньнях вясковых організацый комсамол прымае недастатковы ўдзел у пытаньнях гаспадарчага будаўніцтва. Адным з яўных недахопаў, на мой погляд, зьяўляецца тое, што нашы ячэйкі яшчэ невыстарчальна займаюцца пытаньнем організацыі працы колгасу, пытаньнем ужываньня зьдзельшчыны, нормы выпрацоўкі і г. д.

З боку ЦК ня было дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва паасобнымі раёнамі. Але ў гэты час паасобныя раёны маюць спэцыфічныя галіны працы на грунце разьвіцьця сваёй гаспадаркі. Мы, да гэтага часу ня маем з боку ЦК комсамолу дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва паасобнымі раёнамі.



Дэлегатка зьезду—Негнівецкая; ф-ка „Кастрычнік" (Менск)

Зьмянілі толькі шыльды

Далей пытаньне падрыхтоўкі кадраў. Шэраг вясковых школ пераймепаваны ў школы колгаснай моладзі. Але зьменены былі толькі шыльды. Таго, каб гэтыя быўшыя сямігодкі сталі сапраўднымі школамі колгаснай моладзі, мы яшчэ ня маем.

Далей, таварышы, наконт „Чырвонай Зьмены". Я лічу, што „Чырвоная Зьмена" недастаткова ўдзяляе ўвагі вясковым організацыям. Прывяду прыклад. Шэраг таварышоў з нашых раёнаў пісалі артыкулы, давалі каштоўныя матар'ялы, але „Чырвоная Зьмена" не зьмясьціла гэтыя матар'ялы. Яна, па-мойму, больш адбівае работу гарадзкіх організацый і мала ўвагі ўдзеляе вясковым.

Тав. Емін.—У нашай організацыі былі выступленьні некаторых таварышоў, якія імкнуліся сьцягнуць організацыю з правільных позыцый. За выступленьнем Целешава сачыла ўся комсамольская організацыя. Ён атрымаў патрэбны адпор. Выступленьне сэкратара Чашніцкага РК Шурыца не адрозьніваецца ад выступленьня Целешава. Ён імкнуўся давесьці, што вясковыя ячэйкі ня могуць справіцца з задачамі, якія на іх ускладзены ў сучасны момант. Але, таксама як і Целешаву, яму далі належны адпор.

На праведзеных раённых конфэрэнцыях мы наглядалі актывізацыю правых элемэнтаў у нашай організацыі. Таксама і ў нашым раёне наш піонэр-працаўнік выступіў з такімі думкамі, як і Целешаў, на што організацыя рашуча рэагавала.

Тав. Вайнэр. Выходзячы з становішча нашай беларускай організацыі, з яе практычнай дзейнасьці па ўдзелу ў соц. будаўніцтве і з таго як ЦК ЛКСМБ забясьпечыў мобілізацыю комсамольскай організацыі на актыўны ўдзел у правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў нашай партыі, трэба сказаць, што ў асноўным політычная лінія ЦК была правільнай і практычная дзейнасьць здавальняючай.

Бязьлітасна біць па рэштках Целешаўшчыны

Некалькі слоў аб барацьбе комсамолу з правым опортунізмам, і аб працы нашай раённай організацыі ў гэтым кірунку. Трэба сказаць, што „тэорыя" Целешава атрымала рашучы адпор. Але разам з гэтым мы мелі ў раённых організацыях і выступленьні паасобных таварышоў, у прыватнасьці аднаго сэкратара ячэйкі, які ня толькі падтрымліваў Целешава, але значна пашыраў яго думку аб тым, што актыў загнівае і што ў комсамол рабочая моладзь ня ідзе. Гэтае выступленьне атрымала рашучы адпор ад усёй комсамольскай організацыі.

Тав. Кажэмскі. У кароткіх рысах спыняецца на рабоце сваёй ячэйкі. Ён расказвае аб той барацьбе, якую правёў комсамол на вёсцы супроць кулацкай агітацыі і супроць тых, хто імкнуўся развальваць колгасы.



Дэлегат зьезду сэкратар Гомельскага Гаркому ЛКСМБ т. Пацукоў

На вячэрнім паседжаньні зьезду ад 9-га студзеня выступалі яшчэ таварышы: Калінковіч, Красільшчык, Вайнштэйн, Сірота, Гурыновіч, Вігдорчык і інш. Ад імя колгасу „Прогрэс" зьезд вітаў тав. Ігнацьцеў. У кароткім рапарце ён расказаў аб вялікіх посьпехах комсамолу „Прогрэса" ў галіне колгаснага будаўніцтва.

З рапартам аб выкананьні прамфінпляну шчацінная фабрыкі і аб удзеле рабочай моладзі ў барацьбе за прамфінплян выступіў тав. Барасьневіч.

Няхай жыве рабочая моладзь, няхай жыве комсамол, організатар і ініцыятар рабочай моладзі ў справе ажыцьцяўленьня задач, якія пастаўлены партыяй ў галіне выкананьня пяцігадовага пляну!—скончыў пад бурныя воплескі ўсёй залі тав. Барасьневіч.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Вячэрняе паседжаньне 10-га студзеня

З ЗАЛІ ЗЬЕЗДУ

* 6 гадзін. Фойэ і заля запоўнены дэлегатамі. Ля сцэны прымасьціліся гомельчане. Пакрываючы шум галасоў, зацягваюць песьню. Віцебскія таварышы падтрымліваюць.

* Званок старшыні. Мільгаюць блёк-ноты, раскладваюцца паперы, кнігі.

* Абіраецца група з 9 дэлегатаў для прывітаньня прыбыўшай лыжнай эстафэты

* Спрэчкі па справаздачы ЦК ЛКСМБ.

* Першым выступае т. Казанскі:

— На наш Крычаўскі р-н, дзякуючы яго прыродным багацьцям, выпаў гонар пабудовы буйнейшага ў БССР цэмантнага заводу, які павінен да 1-га кастрычніка 1931 г. забясьпечыць будаўніцтва Саюзу 250.000 бочак цэманту. Але ні ЦК, ні „Чырвоная Зьмена" не ўдзяляюць належнай увагі будаўніцтву гіганта. Трэба пісаць, расказваць грамадзкасьці аб тым, што, дзе і як будуецца, а мы гэтага яшчэ ня робім.

* 9 чалавек выступаюць у спрэчках.

* Зьезд вітаюць лыжная фізкультэстафэта, менскія фізкультурнікі і піонэры Гомельшчыны.

* Абвяшчаецца дзесяціхвілінны перапынак. За ім пачнецца спэцыяльнае паседжаньне зьезду па пытаньню шэфства над энэргетыкай.

* Сёньня плюс да ўсіх убраньняў — вялікая сьвятлавая карта электрофікацыі БССР.

* Тав. Палякоў адчыняе спэцыяльнае паседжаньне зьезду, прысьвечанае ўзяцьцю шэфства над электрофікацыяй.

* ... — Слова для дакладу мае тав. Гольштэйн:

— „Бяз пляну электрофікацыі мы ня можам перайсьці да сапраўднага будаўніцтва" — прыводзіць словы Леніна тав. Гольштэйн. Далей тлумачыць аб значэньні электрофікацыі, аб тым, што павінны будуць рабіць комсамольцы ўзяўшы шэфства.

* Зьезд вітае ад імя інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу Менскага аддзяленьня ГОЭЛРО тав. Гуткін.

* Зьезд таксама вітаюць ад імя рабочых і комсамольцаў Асінстану.

* На гэтым канчаецца праца вячэрняга паседжаньня Х-га зьезду ЛКСМБ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599